# ЦЁПЛАЯ СУСТРЭЧА З ПАЭТКАЙ



За апошні час супрацоўнікі бібліятэкі нашага ўніверсітэта правялі шэраг цікавых мерапрыемстваў. Так, 23 сакавіка ў чытальнай зале бібліятэкі галоўнага корпуса адбылася сустрэча з паэткай, дацэнтам кафедры літаратуры Вольгай Іванаўнай Русілка пад назвай «Да мяне прытулілася слова...». На імпрэзу прыйшлі выкладчыкі і сябры, настаўнікі і школьнікі, цяперашнія і былыя студэнты Вольгі Іванаўны. Вяла імпрэзу бібліятэкар Кацярына Эрнэстаўна Арцямёнак.

Мерапрыемства пачалося з фотапрэзентацыі. Госці пабачылі і краявіды роднай для Вольгі Іванаўны вёсачкі Бершты і фотаздымкі яе маці Любові Мікалаеўны Русілка – вельмі таленавітай жанчыны, якая ўсё жыццё выкладала беларускую мову і якая піша цудоўныя вершы. Падчас прэзентацыі Вольга Іванаўна каменціравала некаторыя фатаграфіі, расказвала пра свае студэнцкія гады, чытала вершы і адказвала на пытанні прысутных.

На сустрэчу завітала старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Т.І. Краснова-Гусачэнка. Тамара Іванаўна агучыла свае рускамоўныя пераклады вершаў Вольгі Іванаўны. Прачытаў яе творы з першага зборніка «Табе» і старшы выкладчык кафедры нямецкай філалогіі, паэт і перакладчык Уладзімір Антонавіч Папковіч. Словы падзякі выказалі былыя вучаніцы Вольгі Іванаўны – сёння вопытныя настаўнікі і выкладчыкі, а таксама студэнты даследчай лабараторыі «Тэорыя і практыка літаратурнай творчасці» філалагічнага факультэта, якія дзякуючы паэтцы сёння актыўна займаюцца літаратурай.

Не абышлося мерапрыемства і без «Музычнай старонкі», якую падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі. Варта адзначыць, што некаторыя вершы Вольгі Іванаўны пакладзены на музыку. Дарэчы, мелодыю адной з песень напела сама паэтка, а аранжыроўку зрабіў былы кіраўнік эстраднай студыі «Шанс» Валерый Дамарацкі. Песня атрымалася задушэўнай і цёплай. Такой жа была і сустрэча. Напрыканцы Вольга Іванаўна і прысутныя сфатаграфаваліся на добрую памяць.

**Таццяна ВАСІЛЬЕВА,**
**студэнтка 5 курса**
**ФлФ.**